# * Абагульненне па раздзеле «Станаўленне старажытных цывілізацый. Беларусь у дадзяржаўны перыяд»

## Аналізуем, тлумачым і разважаем

**1.** Вывучыце інфаграфіку і адкажыце на пытанні.

ГАЛІНЫ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ ← ГІСТОРЫЯ як навука → ДАПАМОЖНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**ГАЛІНЫ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУКІ**
- археалогія
- этнаграфія
- ваенная гісторыя
- эканамічная гісторыя
- гісторыя паўсядзённасці
- гісторыя права і інш.

**ДАПАМОЖНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
- палеаграфія
- генеалогія
- дыпламатыка
- геральдыка
- сфрагістыка
- нумізматыка і інш.



Пячатка князя Ізяслава — заснавальніка полацкай дынастыі князёў. Датуецца X ст., мае надпісы на грэчаскай мове.

А. Назавіце галіны гістарычнай навукі, прадметам вывучэння якіх з'яўляецца знойдзеная пячатка, а таксама дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, што дапамогуць у яе апісанні.

Б. Якія звесткі з гісторыі нашай краіны дазваляе атрымаць дадзены артэфакт?

## Параўноўваем

**2.** Разглядзіце выявы прылад працы і адкажыце на пытанні.



а)



б)

А. Выдзеліце агульнае і адметнае ў прадстаўленых прыладах працы старажытных людзей.

Б. Як называюцца дадзеныя прылады працы і для чаго яны прызначаліся? Выкажыце здагадку, да якіх першабытных перыядаў яны адносяцца.

В. У чым можна ўбачыць прагрэс у развіцці тэхналогій першабытнага чалавека?

## Сістэматызуем веды

**3.** Напішыце эсэ на адну з прапанаваных тэм.

Першабытнае грамадства: вытокі чалавечай цывілізацыі.

Ад каменных прылад да агню — як тэхналогіі змянялі лад жыцця першабытнага чалавека.

Першабытнае грамадства: матэрыяльная і духоўная культура.